

КЛІМАВІЦКАЯ ІНФА-ПАНАРАМА

№20(96)

20 лістапада 2012 Клімавіцкі грамадска-палітычны бюлетэнь

В МИНСКЕ ОТКРЫЛИ МЕТРО, В КЛИМОВИЧАХ — СВИНОМАТОЧНИК

Михаил ПЕТРОВ

Читаешь государственные газеты и попадаешь в светлое царство социализма. А точнее, в застойные времена позднего СССР. В стране процветание и стабильность, наша идеология самая правильная, к тому же нас поддерживает всё прогрессивное человечество. Мудрому и всезнающему вождю впору ставить на повестку дня лозунг: «Экономика должна быть экономной!».

«В день Октябрьской революции в столице заработают три новых станции Минского метрополитена. Открытие участка совпало с 95-й годовщиной Великого Октября». Это вещают своим читателям республиканские СМИ. На дворе ноябрь 2012 года, а белорусов пичкают замшелыми сказками тридцатилетней давности. Режиссёр Сергей Лозница, побывавший в эти дни в Беларуси на кинофестивале «Лістапад», озадаченно рассказывал потом «Комсомольской правде»: «Честно говоря, в Минске я ловлю себя на мысли, что я в 1980-м году». Со стороны наш застой, действительно, заметней.

День Октябрьской революции в Беларуси и отмечать пытаются по обычаям советских времён. Оптимистичный телеведущий бодро рапортует: «В Могилёвской области практически в каждом городе к празднику открылись новые объекты. В Кличеве — магазин, в Черикове — детский дом семейного типа, в Быхове — производственная линия на хлебозаводе». Масштабы, конечно, не такие как в столице с открытием станций метро, но к 95-й годовщине и магазин подойдёт. Ну а в Климовичах с помпой открыли производственный участок свинокомплекса «Сосны». Разумеется, как подчеркнула местная районка, «по доброй традиции 7 ноября».

В этот день сюда приехали председатель райисполкома Захаренко, директор комбината хлебопродуктов Дворкин, другие почётные гости. Произошла церемония открытия объекта, возможно, даже с разрезанием красных ленточек. Тоже ведь один из традиционных атрибутов советского прошлого. Но наследие Великого Октября памятно нам не только этим. Годы застоя были пропитаны ложью сверху донизу. Те, кто пожил при Союзе, хорошо помнят, как на партсъездах народу обещали построить к 1980 году коммунизм, скукожившийся потом до развитого социализма. Так что кинорежиссёр Сергей Лозница ничуть не ошибся с названной им датой.


Свинокомплекс «Сосны», где в честь 7 ноября открывали маточник для получения приплода, подчиняется Климовичскому комбинату хлебопродуктов. На КХП, если судить по хвалебным отзывам в прессе, дела идут настолько замечательно, что можно только позавидовать. Хотелось бы верить, но и белорусский агитпроп даёт иногда маху. Например, в республиканской газете «Белорусская нива» от 23 октября написали, что «на комбинате сложился крепкий коллектив, а средняя зарплата уже превысила отметку в 500 долларов». А через несколько дней климовичская районная газета от 27 октября сообщила, что «сегодня на КХП в среднем зарабатывают около 3,5 млн. рублей в месяц». Добавим, что на сегодняшний день свиноводы комбината занимают лишь 86 место среди 105 комплексов страны по выращиванию и откорму свиней. Так что застойная привычка к приукрашиванию действительности никуда в нынешней Беларуси, как и в БССР образца 1980-го года, не делась. И это тоже в лучших традициях Великого Октября.

СТАНЕМ ЗА ЖУРНАЛІСТЫКУ!

Незалежныя маланакладныя газеты Магілёўскай вобласці выдалі да 5 лістапада – сусветнай акцыі “Станем за журналістыку!” - адмысловы нумар супольнага выдання "зБАЖына”.

Ва ўступным артыкуле сябра Праўлення ГА “ Беларуская асацыяцыя журналістаў ” Генадзь Суднік распавёў пра акцыю і згадаў асноўныя “балявыя кропкі” беларускай журналістыкі — справы Пачобута і Сурапіна, сітуацыю з часопісам “Arche”, затрыманні і адміністратыўныя справы магілёўскіх калег.

Сярод іншых тэм нумару — юбілей крычаўскай газеты “Вольны горад”, расповед пра дзейнасць бялыніцкай “Паходні”, горацкага “УзГорка”, “Клімавіцкай Інфа-Панарамы”, “Шклоў-інфо”. Знайсці нумар "зБАЖыны” можна на сайце БАЖ па спасылцы http://baj.by/be/node/18260



ЧТО ТАКОЕ МИНИМАЛКА? ХОЧЕШЬ ЕСТЬ, А ТРАТИТЬ ЖАЛКО!

Елена ПОЛЯКОВА

Как сообщает Министерство труда и социальной защиты, произошло очередное индексирование минимальной заработной платы. Таким образом, месячная минимальная зарплата за октябрь текущего года составила 1109120 руб. Улучшит ли положение трудящихся повышение минималки?

ПЕРИОД	Размер минимальной заработной платы (руб.)	
	месячной	часовой
январь	1 000 000	5 930
февраль	1 000 000	5 930
март	1 000 000	5 930
апрель	1 000 000	5 930
май	1 047 550	6 210
июнь	1 047 550	6 210
июль	1 054 010	6 250
август	1 104 640	6 550
сентябрь	1 104 640	6 550
октябрь	1 109 120	6 580

Согласно закону «Об установлении и порядке повышения размера минимальной заработной платы» размер МЗП, установленный законодательством и проиндексированный, является обязательным для нанимателя в качестве низшей границы оплаты труда работников. Размер МЗП является обязательным для всех нанимателей, с которыми работники состоят в трудовых отношениях, основанных на трудовом договоре (контракте). Фактически это государственный минимальный социальный стандарт в области оплаты труда за работу в нормальных условиях при выполнении установленной нормы труда.

Но государственные стандарты и реальная жизнь в белорусском государстве не всегда совпадают. Например, как свидетельствуют эксперты специализированного сайта http://mojazarplata.by, неизвестно даже количество работников, получающих минималку: «В Беларуси не ведётся статистика по работникам, получающим минимальную зарплату. По различным данным эта цифра может колебаться от 12 до 30%».

Также с каждым месяцем становится всё более очевидно, что жить на установленный государством минимум невозможно, можно только выживать. Конечно, Правительство периодически пересматривает размер МЗП, но посудите сами, как это происходит (смотри таблицу):

С января по октябрь, то есть за 10 месяцев текущего года, МЗП выросла с 1 миллиона до 1109120 руб. Практически за год минималка увеличилась всего на 109 тысяч! Как говорят в таких случаях — ложись и помирай. Нам постоянно рассказывают о социальном государстве и замалчивают, что белорусы, получающие минимальную зарплату, зарабатывают по закону меньше доллара в час, а в месяц выходит примерно 130 долларов. Разве это нормально?

Моя знакомая, работающая кастеляншей в детском саду, жаловалась по этому поводу: «Рабочий день составляет 8 стандартных часов, а платят мне за них минимальную заработную плату. Получаю один миллион сто десять тысяч. И уволиться не могу, заведующая не отпускает. Кого она сможет за такие деньги на это место найти? Ну а я почему должна страдать, не понимаю. Муж стал ездить на заработки в Россию, только ведь и это не выход. Что будет дальше, ума не приложу».

Откровенно говоря, после таких рассказов больше всего хочется, чтобы чиновники, устанавливающие размер минималки, сами попробовали жить целый месяц на этот разнесчастный миллион.

БЕЛАРУСЬ БЫЛА НА ГРАНИ ДЕФОЛТА

Кирилл БУКИН, gazetaby.com

Глава правительства Мясникович выступил на пленарном заседании Консультативного совета по иностранным инвестициям при Совете министров Беларуси. И сделал сенсационное заявление (цитируется по www.interfax.by):

«Ограничительные действия со стороны правительства в 2011 году содействовали стабилизации и недопущению дефолта, который реально просматривался, и обеспечению стабильности валютного рынка. Эти меры были временными, они были отменены после стабилизации ситуации».

Ранее ни один из высокопоставленных чиновников не признавал, что Беларусь находилась на грани дефолта. Впрочем, Мясникович тоже, скорее всего, проговорился нечаянно — в процессе полемики с главой представительства Европейского банка реконструкции и развития в Беларуси Френсисом Делеем, сказавшим, что в нашей стране «правила игры всё время меняются» и в качестве примера упомянувшим, как «во время экономического кризиса 2011 года власти ввели ценовой, экспортный и валютный контроль, что негативно повлияло на частный сектор».

Премьер-министру очень хотелось оспорить это утверждение. Поэтому в качестве контраргумента Мясникович заявил, что именно ограничительные меры спасли Беларусь в прошлом году от краха. Однако признание главы правительства скорее свидетельствует о том, сколь непрочна национальная экономика.

Предвыборная программа Александра Лукашенко образца 1994 года называлась «Отвести народ от пропасти». С тех пор прошло без малого два десятка лет, но страна, если верить Михаилу Мясниковичу, по-прежнему на краю бездны.





В КОМИССИИ ИЗ ПЯТИ ЧЕЛОВЕК ТРИ ЗАМА И ОДИН ЧЛЕН

Александр ВЛАД

Заместитель председателя Могилёвского облисполкома Владимир Кравцов сложил с себя полномочия и официально сдал бразды правления экономикой областью. Это связано с его избранием депутатом Палаты представителей. Правда, он по-прежнему будет заниматься экономическими вопросами, но уже в стенах парламента. Пётр Рудник, глава облисполкома, пожелал Владимиру Васильевичу успехов в новой деятельности.

В СМИ уже сообщалось о том, что депутат от Кричевского избирательного округа №83 (Климовичский, Кричевский и Хотимский районы) В.В. Кравцов возглавил в парламенте Постоянную комиссию по экономической политике. Данная комиссия занимается регулированием законодательных вопросов в сфере инвестиционной деятельности, государственной собственности и акционирования. С учётом этого прогнозировалось, что членов комиссии ожидает значительный объём работы. Ближайшие годы пройдут для белорусского общества под знаком распродажи предприятий, недр, земельных участков. Денег в стране катастрофически не хватает, поэтому для пополнения бюджета на аукцион выставят общенародное достояние.

Спросят ли при этом сам народ — вопрос, как говорится, риторический. Возможно, его и пригласят поучаствовать в предстоящей делёжке, но что ему делать у барского стола с нынешними мизерными доходами? Только наблюдать, как другие, более удачливые участники приватизации становятся владельцами заводов, газет, пароходов.

Понимая всю сложность перераспределения государственного пирога на лакомые куски частной собственности, желающих попасть в созданную Постоянную комиссию по экономической политике было совсем немного. Она не случайно стала одной из самых малочисленных по составу среди остальных комиссий. Если в других числятся по 9-10 человек, то сюда пожелали войти всего 5 депутатов. Кто же эти рисковые люди?

Состав Постоянной комиссии по экономической политике состоит из председателя (Кравцов В.В.), трёх его заместителей (Валюшицкий В. И., Колтунов Н.А., Щепов В.А.) и одного члена (Кубракова Л.П.). Как видим, в комиссии всего один член, это Кубракова Людмила Петровна. Мужчины не пожелали уступить ей руководящие места и взяли себе более солидные должности. Но соответствуют ли они своему новому статусу? Давайте разберёмся с персональным составом комиссии.

Л.П. Кубракова до своего депутатства работала специалистом Департамента администрации ОАО "БПС-Сбербанк". В.И. Валюшицкий — директор ОАО "Брестский центральный универмаг". Н.А. Колтунов — директор совместного белорусско-британского предприятия "Кровля" в Осиповичах. В.А. Щепов — декан экономического факультета УО "Гомельский государственный университет имени Франциска Скорины". Судя по всему, практическое знакомство с реальной экономикой имеется только у Владимира Кравцова. Можно считать, что он по праву стал во главе этой комиссии. А вот к его соратникам у нас такого доверия нет. Смогут ли они компетентно заниматься регулированием законодательных вопросов госсобственности и акционирования, мы не знаем. Вполне вероятно, что уже в следующем году на них свалится такая гигантская ответственность, которая окажется им просто не по силам. Задуматься об этом должны и их избиратели, многие из которых трудятся на пока ещё не приватизированных предприятиях. Ведь грандиозный передел народного достояния затронет интересы всех без исключения членов общества.

ЗОНА ЕЎРА РЫХТУЕЦЦА ДА АБНАЎЛЕННЯ БАНКНОТ

Прадстаўніцтва ЕС у Беларусі паведаміла наступную інфармацыю. Еўрапейскі цэнтральны банк і нацыянальныя банкі краін зоны еўра рыхтуюцца ўвесці ў абарачэнне другую серыю банкнот еўра.

Новыя грошы будуць адрозніваца ад старых дадатковай абаронай ад падробак, наяўнасцю галаграмы і вадзяных знакаў з выявай Еўропы — персанажа грэцкай міфалогіі.

Першая серыя спачатку будзе выкарыстоўвацца разам з новымі банкнотамі, але праз некаторы час перастане быць законным плацёжным сродкам. Першая банкнота новага ўзору наміналам 5 еўра будзе афіцыйна прадстаўленая 10 студзеня 2013 года. У абарачэнні яна з'явіцца ў маі 2013 года.

СТВОРАНЫ ЕЎРАПЕЙСКІ ФОНД ЗА ДЭМАКРАТЫЮ

Як паведамляе БелаПАН, фонд пачне працу ў 2013 годзе. Еўракамісія выдзеліла яму 6 млн. еўра, якія прызначаны для аблягчэння пачатковага этапу працы арганізацыі.


Асноўная мэта фонду — падтрымка працэсаў дэмакратызацыі. Як адзначаецца ў паведамленні прэс-службы, дзейнасць фонду не будзе абмяжоўвацца толькі суседзямі ЕС. Арганізацыя будзе падтрымліваць дэмакратычныя рухі і іх лідараў, няўрадавыя арганізацыі, незалежныя СМІ і адукацыйныя ўстановы, якія вымушаны працаваць у выгнанні. Фонд стане «дадатковым інструментам палітыкі і рэагавання на дынамічныя перамены» ў суседніх з ЕС краінах.

ИНОСТРАННЫМ ИНВЕСТОРАМ РАЗРЕШАТ ПРИОБРЕТАТЬ ЗЕМЛЮ В ЧАСТНУЮ СОБСТВЕННОСТЬ



Иностранным инвесторам в Беларуси планируют в 2013 году предоставить возможность приобретать землю в частную собственность.

Об этом, как передало БЕЛТА, сообщил на Консультативном совете по иностранным инвестициям министр экономики Николай Снопков. «Уже в 2013 году мы планируем решить вопросы с предоставлением иностранному инвестору возможности получить землю в частную собственность», — отметил министр.



КАК ОТПРАВИТЬ ОТЦА В ДЕКРЕТНЫЙ ОТПУСК

Виктор ЛИСТОПАДОВ, zautra.by

Семейный кодекс РБ предоставляет и отцу, и матери в Беларуси абсолютно равные права. Тогда почему отпуск по уходу за ребёнком берут 99% женщин и только 1% мужчин?



— В этот процент входят и отцы, и дедушки, и другие члены семей. В том числе в ситуации серьезной болезни и даже смерти матери, — отмечает заведующая кафедрой современных коммуникаций Института журналистики БГУ Ирина Сидорская

В Германии каждый четвёртый молодой отец берет отпуск по уходу за ребёнком. А ещё в 2007 года доля мужчин, временно оставивших работу для ухода за детьми, составляла всего 3,5%. Отцы стали активнее, поскольку государство предложило мотивацию. Если в декрет уходит только один из родителей, оплачивается лишь год, а в случае готовности обоих партнеров государство компенсирует 14 месяцев отпуска по уходу за ребёнком. Родители сами решают, кто на какой срок уйдёт в декретный отпуск. Размер пособия напрямую связан с уровнем среднего ежемесячного дохода того из родителей, кто берёт отпуск. По немецким законам, размер родительского пособия не может быть ниже 300 и выше 1800 евро в месяц.

В Швеции отпуск по уходу за новорожденным — 16 месяцев, но только в том случае, если каждый из родителей возьмет хотя бы два месяца. Большинство отцов в отпуске по уходу за ребёнком бывают. Размер пособия — 80% от заработка.

В Беларуси атмосфера вокруг рождения ребёнка складывается так, что он оказывается маминой «игрушкой». И если семья распадается, в ход идет ещё один распространённый гендерный стереотип: ребёнок нужен только матери. Это означает, что после развода он может остаться только с ней. Особенность нашей ситуации хорошо демонстрируют интернациональные браки:

— Расторжения брака с иностранцами — пример того, как мужчины борются за своих детей. Для них абсолютно не однозначно то, что ребёнок остаётся с матерью. Это только наша установка, что ребёнок в случае развода является ответственностью женщины, — подчёркивает Ирина Сидорская.

ДАПАМОГА НА ДЗІЦЯ ПАВЯЛІЧЫЦЦА НА 3 ПАЧКІ КАШЫ

Вікторыя ПРАКАПОВІЧ, svabodaby.net

З 1 лістапада бягучага года ў чацвёрты (і апошні на сёлета) раз павысіцца памер дапамогі сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей ва ўзросце да 3 гадоў. Павелічэнне складзе 4,3%, або 36 160 рублёў. На гэтую суму шчаслівыя бацькі змогуць набыць, напрыклад, 3 пачкі дзіцячай кашы беларускай вытворчасці.

Дапамога з надбаўкай 75% складзе 1,540 млн рублёў, з надбаўкай 40% — 1,234 млн рублёў. Штомесячная дапамога па доглядзе дзіцяці старэй за 3 гады, па звестках Міністэрства працы і сацыяльнай абароны, будзе роўная 440 020 рублям.

Нагадаем, што памер дапамогі на дзяцей ва ўзросце да 3 гадоў сёння роўны памеру бюджэту пражытачнага мінімуму і пераглядаецца раз у квартал. У перыяд з 1 жніўня па 31 кастрычніка ён складаў 843 870 рублёў.

МАТЕРИНСКИЙ КАПИТАЛ В РОССИИ И БЕЛАРУСИ

Материнский капитал давно применяется за границей, а в последние несколько лет его стали использовать в России. В нашей же стране официальные лица до сих пор говорят, что этот вопрос требует серьёзной проработки. Например, заместитель министра труда и соцзащиты РБ Пётр Грушник считает: «Тема материнского капитала нам близка, но мы к ней только подступаем. Предстоит серьёзная работа, необходимо взвесить все за и против прежде, чем принимать решение. Тем более что введение данного механизма влечёт значительные финансовые затраты. И нужно соотнести их с тем демографическим эффектом, к которому может привести новая форма социальной поддержки семей».

В России право на получение материнского (семейного) капитала при рождении (усыновлении) второго ребёнка или последующих детей предоставляется семьям с 1 января 2007 года. Средства материнского капитала не облагаются налогом, индексируются с учетом темпов роста инфляции и могут быть направлены на улучшение жилищных условий, получение образования детьми и накопительную часть трудовой пенсии матери. С 2012 года размер



материнского (семейного) капитала составил 387,6 тыс. российских рублей. В 2007-2012 годах было выдано более 3 млн. государственных сертификатов на материнский (семейный) капитал. Эксперты считают, что благодаря этому в России произошёл рост рождаемости: число новорожденных выросло на 23,3% с 1 млн. 457,4 тыс. детей в 2005 году до 1 млн. 796,6 тыс. в 2011 году.



КРЫЧАЎСКАЯ ВОЛЬНІЦА

Алесь ЛАПО

Помнік кіраўніку сялянскага руху сярэдзіны XVIII ст. Васілю Вашчыле ў Клімавічах Акадэмія Навук РБ прапанавала ўключыць у Зводны план устаноўкі манументальных збудаванняў у Беларусі ў 2009-12 гг. (газ. "Культура". 6 чэрв. 2009 г.).

Крычаўскае староства, якое размяшчалася на тэрыторыі сучасных Клімавіцкага, Касцюковіцкага, Хоцімскага і Крычаўскага раёнаў, ніколі не вызначалася пакорлівасцю ды паслухмянствам. Сам жа кіраўнік паўстання Васіль Вашчыла нарадзіўся на Клімаўшчыне, у вёсцы Лобжа, аднак бацькі яго паходзяць са Старадубшчыны, з вёскі Чамаданава. Сям'я перабралася ў Крычаўскае староства ў канцы XVII ст., аднак пазней была вымушана вярнуцца на радзіму. Васіль застаецца ў Беларусі і з часам становіцца войтам вёскі Селішча.

З др. пал. XVII ст. Крычаўскае староства стала ўладаннем Радзівілаў, аднак самастойна гэтымі землямі яны не кіравалі: здавалі ў арэнду. З 1731 па 1740 гг. у старостве валадарылі яўрэйскія арандатары браты Іцкавічы, не зацікаўленыя ані ў сялянскім дабрабыце, ані ў эканамічным развіцці края. Яны бязлітасна эксплуатавалі сялянскую гаспадарку. Неаднаразова Вашчыла пешшу накіроўваўся да Геранімa Фларыяна Радзівіла ў Варшаву ці Мір з сялянскімі скаргамі на арандатараў. Але гаспадар не надзяляў увагі сялянскім праблемам, таму з вяртаннем Васіля чакала збіццё бізунамі ды турэмнае зняволенне. Трываць здзекі стала немагчыма. Вясной 1740 г. Вашчыла збірае ўзброены сялянскі атрад. Паўстанцы нішчаць буды (прадпрыемствы па вырабу паташу), на якіх сяляне прымусова працавалі, грамілі маёнткі шляхты і ліхвяроў, знішчалі даўгавыя кнігі. Арандатары былі выгнаны, а іх месца занялі кіраўнікі паўстання. Корчмы, ветракі, рудні, сукнавальні пераходзілі ў іхнае карыстанне. Кіраўнікі паўстання пачалі самі збіраць падаткі і спраўна іх высылалі Радзівілу.

Улетку 1741 г. у Крычаўскае староства быў накіраваны новы арандатар — Храптовіч. Ён з мэтай улагодзіць бунтаўшчыкоў раздаваў ім землі і піцейныя установы. Вашчыла праз пасрэдніцтва арандатара стаў уладальнікам урочышча Казельск. У 1743 г. Г. Ф. Радзівіл адмаўляецца ад практыкі здачы ў арэнду староства: у Крычаў прыязджае адміністратар Цялецкі, які першым чынам з мэтай вызначыць стан сялянскай гаспадаркі плануе правесці інвентарызацыю. Дробныя шляхціцы-арандатары, незацікаўленыя ў гаспадарчым перапісу, бо ён выявіў бы парушэнні ў дамоўленасцях з Радзівілам, пачалі падбухторваць сялян да ўзброенага выступу. З мэтай каардынацыі дзеянняў шляхты з будучымі кіраўнікамі паўстання ў ліпені 1743 г. у в. Канахоўка адбылася сустрэча шляхціча Валовіча з Вашчылам і ягонымі паплечнікамі Ветрам і Бачко. Гэта прычына і расійская агітацыя прывялі да Крычаўскага паўстання.



Радзівіл пачуўшы пра хваляванні даслаў на Крычаўшчыну ўзброены атрад палкоўніка Пястжэцкага, які спачатку ў Крычаве (18 студзеня 1744 г.), а затым пад вёскай Царковішча (26 студзеня 1744 г.) разграміў паўстанцаў. Усяго з боку бунтароў было забіта больш за 300 чалавек, больш за 1 тыс. паранена, ды чвэрць тысячы палонена.Страты радзівілаўскага войска куды болей сціплыя: 3 забітых і 6 параненых. Кіраўнікам паўстання, згодна з рашэннем крычаўскага магістратнага суда, былі вынесены пакаранні на любы густ: васьмярым — пасаджэнне на кол, чатыром — адрубанне галавы, столькі ж павешана на шыбеніцы, дзесяцярым — пакаранне бізунамі і адразанне вуха.

Найбольшых маштабаў хваляванні дасягнулі ў Мілаславіцкім (Вуглянскім) войтаўстве, якое амаль цалкам супадае з абрысамі цяперашняга Клімавіцкага раёна. Невыпадкова буйнейшая бітва паўстання адбылася ў вёсцы Царковішча, жыццё Васіля Вашчылы звязана з вёскамі Лобжа і Селішча, паўстанцкі штаб часова знаходзіўся ў вёсцы Свірэль, а перадвызначыла ўзброенае выступленне сустрэча ў вёсцы Канахоўка. Гэта дазваляе перakанаўча адносіць паўстанне Вашчылы да падзей з гісторыі Клімаўшчыны.

Вашчыла здолеў уцячы ад пакарання ў Расію, аднак ад смерці гэта яго не выратавала: летам 1744 г., захварэўшы на дызентырыю, ён памёр у Кіева-Пячорскай крэпасці. Хто такі Васіль Вашчыла для беларускай гісторыі — нацыянальны герой, змагар за сацыяльную справядлівасць ці агент варожай Расійскай імперыі — гэтае пытанне дасюль застаецца адкрытым.

ДАВЕДКА "КЛІМАВІЦКАЙ ІНФА-ПАНАРАМЫ":

Вашчыла Васіль Мацвеевіч — Нарадзіўся у 1690 г. у вёсцы Лобжа Крычаўскага павета Мсціслаўскага ваяводства (цяпер Клімавіцкі раён). У дарослым узросте селянін вёскі Селішчы. Насіў уладальніку Крычаўскага староства Радзівілу скаргі сялян на злоўжыванні і самавольства арандатараў, за што неаднаразова быў зняволены. Быў выбраны войтам вёскі Селішчы. У маі 1740 года ўзначаліў першы ўзброены атрад з некалькіх сотняў сялян, да якога пазней далучыліся сяляне з іншых шляхецкіх уладанняў. У сярэдзіне 1741 г. у сялянскіх хваляваннях, якія ахапілі большую частку Крычаўскага староства, удзельнічала некалькі тысяч чалавек. Сяляне грамілі маёнткі шляхты і ліхвяроў, знішчалі даўгавыя кнігі. У канцы 1743 – пач. 1744 гг. барацьба прыняла характар узброеннага паўстання. У баях пад Крычавам і каля вёскі Царковішча войскі Геранімa Радзівіла разбілі дрэнна ўзброенныя сялянскія атрады і жорстка расправіліся з паўстанцамі. Вашчылу ўдалося ўцячы на Латакоўскі расійскі фартпост, адкуль ён быў пераведзены на Цімошынскую пагранічную заставу. Радзівіл запатрабаваў аддаць яму Вашчылу як сялянскага важака, які павінен адказаць за ўсе "ліхадзействы". Каб не трапіць у рукі карнікаў, Вашчыла выдаў сябе за расійскага падданага. Пакуль ішло следства, ён сядзеў у Кіева-Пячорскай крэпасці, дзе захварэў і неўзабаве памёр. Згодна з "Энцыклапедыяй гісторыі Беларусі", кіраўнік сялянскага паўстання Васіль Вашчыла памёр 28.8.1744 года.



ПАВЕЛ КАВАЛЁЎ І ВАСІЛЬ БЫКАЎ

Сяржук АРЖАНЦАЎ


Павел Нічыпаравіч Кавалёў нарадзіўся 5 (18) лістапада 1912 г. у вёсцы Склімін Клімавіцкага раёна ў простай сялянскай сям'і. Працоўны шлях пачаў настаўнікам і журналістам, потым быў рэдактарам літаратурных часопісаў, сам напісаў шэраг кніг. У Савецкай Беларусі ён лічыўся вядомым пісьменнікам, напрыклад, апавяданне «Чырвоны лядок» вывучалі ў школах. Сёння, да 100-годдзя з дня нараджэння нашага земляка, прапануем успомніць адзін цікавы і вельмі істотны момант з ягонай творчай біяграфіі. Паўла Кавалёва добра ведаў і быў з ім у даволі прыязных адносінах Васіль Быкаў.

Пасля вайны Быкаў займаўся не літаратурай, ён яшчэ нават не думаў, што будзе пісьменнікам. Будучы класік прыехаў у Гродна, дзе ўладкаваўся ў рэдакцыю абласной газеты. Мала хто ведае, але самы знакаміты аўтар беларускай ваеннай прозы спачатку спрабаваў свае здольнасці ў зусім іншым жанры. У тыя гады на газетных старонках з'яўляліся напісаныя ім юмарэскі і фельетоны. А Кавалёў якраз кіраваў часопісам "Вожык". Ён і заўважыў маладога Васіля з "Гродзенскай Праўды". Сам Быкаў так успамінаў аб гэтым: "Пісаў сатырычныя апавяданні ў «Вожык». Некаторыя друкавалі, рэдактар часопісу Павел Кавалёў ставіўся да іх прыязна".

Але неўзабаве Быкаў адчуў, што фантавы лёс паклікаў яго да іншага, сапраўднага прызвання. У сусветнай літаратуры з'явілася новае імя, на ўзроўне Рэмарка, Бёля, Хемінгуэя. Гэта разумелі як верныя сябры і таварышы пісьменніка, так і ягоныя ворагі і нядобразычлііўцы. Вядома, што ўсе творы Быкава праходзілі праз самую пільную цэнзуру, некаторыя не друкаваліся дзесяцігоддзямі. І сягоння мы можам ганарыцца тым, што ў гэтыя няпростыя часы Павел Кавалёў дапамагаў даносіць да чытачоў жорсткую праўду аб Вялікай вайне.

У 1967-1972 гг. ён працаваў галоўным рэдактарам часопіса «Полымя». Менавіта пры яго рэдактарстве ў часопісе ўбачылі свет такія вядомыя апавяданні Быкава, як "Круглянскі мост" і "Сотнікаў". "Круглянскі мост" узялі ў "Полымя" у 1969 г. (аповесць надрукавана ў №2). Гэта быў новы, дасюль невядомы погляд на абставіны партызанскай барацьбы ў Беларусі, які абсалютна не адпавядаў канонам сацрэалізму. Дарэчы, вельмі высока ацаніў "Круглянскі мост" Аляксандр Твардоўскі. Яшчэ адной творчай вышынёй для пісьменніка з'явіўся "Сотнікаў", які амаль адразу стаў гучнай падзеяй у літаратурным жыцці. У «Полымі» апавяданне апублікавалі ў 1970 г. у №11.

На думку Васіля Быкава, дзве гэтыя публікацыі прывялі да адстаўкі Кавалёва з пасады галоўнага рэдактара. Камуністычныя ўлады ўбачылі, што ён робіць выбар на карысць праўды, а не ідэалогіі. Тое ж пацвярджае і быкаўская характарыстыка ў пазнейшых успамінах: "Паводле сваёй прыроды то быў неблагі чалавек, не апантаны бальшавік, памяркоўны і абачлівы". Сапраўды, гэта трапная характарыстыка Паўла Нічыпаравіча Кавалёва, з якой ён застанецца ў гісторыі нацыянальнай літаратуры і ў памяці наступных пакаленняў беларусаў.



«МІЛІЦЫЮ МОЖНА СМЕЛА СКАРАЦІЦЬ НА 30%»

Так лічыць падпалкоўнік міліцыі ў запасе Мікалай Казлоў. Ён пракаментаваў Радыё Свабода вынікі прэзідэнцкай нарады па рэформе органаў МУС.

«Неабходна скараціць колькасць, вызваліць міліцыю ад неўласцівых ёй функцый і прывесці вайсковы складнік у адпаведнасць з патрабаваннямі сённяшняга дня», — такія патрабаванні выказаў Аляксандар Лукашэнка на нарадзе па рэформе органаў МУС.

Прэзідэнт неаднаразова выказваўся за скарачэнне колькасці міліцыянтаў. Сапраўды, паводле статыстычных дадзеных, у Беларусі найбольшая колькасць міліцыянтаў на душу насельніцтва ў СНД. На кожную тысячу жыхароў прыпадае ажно 14 праваахоўнікаў. Нават у Расіі іх усяго 9,7 на кожную тысячу, а ва Украіне — 6,5.

У той жа час, прымаючы з дакладам міністра МУС Ігара Шуневіча на пачатку лістапада, Аляксандар Лукашэнка казаў, што міліцыянтам трэба даць «болей улады».

Каментуючы гэтую заяву для Радыё Свабода, генерал-лейтэнант міліцыі ў адстаўцы Мечыслаў Грыб сказаў, што не бачыць у павелічэнні паўнамоцтваў супрацоўнікаў міліцыі ніякай патрэбы. «Мне здаецца, што ў міліцыі сёння дастаткова ўлады, дастаткова заканадаўчай базы — трэба, каб гэтыя законы выконваліся. Бо колькі ты ўлады міліцыі ні давай, але пакуль яна будзе пытацца дазволу на правядзенне аператыўна-вышуковых мерапрыемстваў адносна некаторых службовых асобаў (а гэта сёння мае месца) — становішча не зменіцца», — лічыць Грыб.

Мікалай Казлоў, падпалкоўнік міліцыі ў запасе, кажа, што беларускую міліцыю можна смела скараціць на 30 адсоткаў: «У нас вельмі шмат міліцыянтаў. Але дзіўна, што ўсе скарачэнні пачынаюцца з крымінальнага блоку. Пры гэтым у нас столькі войскаў, што невядома, чаго мы чакаем. Найперш трэба скарачаць унутраныя войскі. Усё, што тычыцца папраўчых установаў — турмы, СІЗА, — усё гэта трэба перадаваць Міністэрству юстыцыі. І галоўнае — у нас безліч палкоў, брыгадаў. Іх занадта шмат».



ГОЛОДОМОР — ГОЛОД И СМЕРТЬ МИЛЛИОНОВ

История СССР — это история бесконечного противостояния власти и общества. Это непрерывные выступления, бунты, восстания, ожесточенное сопротивление народов и отдельных одиночек. Государственный террор и репрессии подавляли общественное недовольство, но оно вспыхивало вновь и вновь. В ответ на это против непокорившихся с ещё большей силой применялись самые жесточайшие меры. Восставших жителей Тамбовской губернии травили боевыми газами, рабочие демонстрации Новочеркасска давили танками, в тюрьмы и психушки тысячами сажали за антисоветские анекдоты. В ряду этих бесчеловечных событий особое место занимают ужасы Голодомора.



В годы коллективизации Сталин и его окружение обрекли на голодную смерть миллионы крестьян, чтобы насильственно заставить их принять колхозы. Многочисленные документальные свидетельства показывают, что наибольшие жертвы от людоедской политики сталинизма понёс украинский народ. Исследователи считают, что в результате Голодомора в 1932-1934 гг. погибло не меньше трёх миллионов украинцев. Самое ужасное то, что репрессивные органы специально и сознательно использовали массовый голод против мирного населения. Говоря об этом, мы хотим напомнить, что последствия Голодомора не обошли и тогдашнюю Беларусь и, в частности, отразились на Климовичском районе. Об этом малоизвестном эпизоде нашего прошлого можно узнать из работы историка Ирины Романовой. Предлагаем ознакомиться с несколькими выдержками из её исследования:

«К началу 1930-х годов в Беларуси, как и во всём Советском Союзе, между государством и крестьянами велась настоящая война. Государство стремилось выжать из крестьян максимум урожая. Крестьяне же, со своей стороны, делали всё возможное, чтобы сбить планы обязательных поставок. Всё это в совокупности вело к дезорганизации в сельском хозяйстве. Локальный голод не покидал деревню даже в урожайные годы. Неблагоприятные природные условия 1931 и 1932 гг. ухудшили и без того неважное положение сельского хозяйства. А потом потекли беженцы из Украины, в которой Голодомор начался раньше. Ходоки предупреждали, что такое положение в скором времени будет и в Беларуси.

Первые известия о голоде в Беларуси начали поступать с лета 1932 г.: "Положение в Туровском районе с обеспечением хлебом нуждающейся части колхозников до чрезвычайности напряжённое. Конец сева в этих колхозах характерен невыходами на работу по причине голодания и невозможности физически работать". С лета 1933 г. сигналы с мест в центр о голоде стали массовыми. В Ушачском районе "многие колхозники уже теперь не имеют хлеба и питаются разными суррогатами". В тяжёлом положении, согласно докладной из Житковичского района, находились 33 колхоза района, или около 4,5 тыс. человек. По 68 колхозам зоны Климовичской МТС из 4200 семей 3000 не имели никаких продуктов вовсе.

В Пуховичском районе "во многих колхозах района положение с недостатком хлеба создалось неважное, имеются случаи заболевания от голода, невыход на работу и т. д.". В колхозе "Перамога" Минского района "колхозники в большинстве случаев питаются травой, которую варят и забеливают молоком. За последнюю неделю имеются случаи опухания у отдельных колхозников ног, рук, лица, и во время работы валятся с ног. Среди колхозников царят упадническое настроение и паника. Ожидают смерти и просят разных лиц забрать у них детей и спасти их от голодной смерти". О чрезвычайно тяжёлом положении с питанием сообщали с Гомельщины: "Из 93 колхозов в районе примерно по 45 отсутствуют какие бы то ни было продукты питания как в колхозах, так и у самих колхозников. В колхозе "Вольная праца" умерли из-за отсутствия питания 4 человека, в колхозе "Воля" — 3 человека, в колхозе "Пески" — 2 человека, немалая часть уже заболела — опухают".

Из письма в ЦК ВКП(б) Марка Соболева о положении в Могилёвском районе: "Станкевич сам умер от разрыва сердца или, вернее, от того, что он был бессилен кормить свою семью, теперь осталась жена с четырьмя детьми. Ходит, просит милостыню у соседей, вымаливая по две-три картофельки и, сваривши один горшок, этим живёт с детьми целые сутки. Ребенок в 1 S года выглядит, как трёхмесячный, весь чёрный и высох в орех… Я бы от себя посоветовал создать музей коллективизации и все такие диковины собирать и показать всему миру, до каких ужасов мы докатились".

12 января 1934 г. красноармейцу Космачёву в г. Бобруйск родные из деревни Тихань Климовичского района писали: "Праздники справили хорошо, только кушать было нечего… трудодней много, около 800, а хлеба получили 3 пуда, а картофель и др. культур совсем не получили, так что обстоятельства наши очень и очень неважные". Последнее письмо родители написать сами уже не смогли: "Дорогой брат, уведомляю о том, что отец Ваш сильно опух и плох и мать Ваша, а телеграмму послать нет денег, то, пожалуйста, проситесь домой, Ваш отец пока жив, но без сознания, то, пожалуйста, проситесь, хотя Вы и служите на военной службе, то, пожалуйста, извернитесь домой, может быть отца застанете в живых, но мать не заспеете. Сестра Ваша в больнице, так приезжайте, распорядитесь сами, а то у нас хоронить теперь очень дорого. Ямку рыть — всё трудодень пропадает…".

Трагедия заключалась в том, что власть голод не признавала, потому не могла идти речь и о спасении людей: нет голода — нет проблемы. Однако в порядке успокоения общественной мысли были расстреляны 10 руководителей Наркомата земледелия СССР, репрессировано значительное количество республиканских, областных, районных, сельсоветских и колхозных руководителей "за организацию голода в стране"».



ДАПАМАЖЫЦЕ ПТУШКАМ, ЗРАБІЦЕ КАРМУШКУ!
Тры варыянта ад сайта 34mag.net



Варыянт 1

Што трэба: пластыкавая бутэлька, маркер, нож, нажніцы, шнур, скотч.

* Крок 1. Бярэм пустую пластыкавую бутэльку і вызначаем маркерам адтуліну для акенца (яго памер залежыць ад бутэлькі). Нажом выразаем акуратную адтуліну, нажніцамі раўняем няроўнасці. Заляпляем краі скотчам (для бяспекі вашых крылатых сяброў).

* Крок 2. Адкручваем корак нашай пасудзіны і робім у ёй дзірачку для шнура. На канцы шнура абавязкова робім тры-валы, тоўсты вузел. Прасоўваем у адтуліну корка наш шнур і закручваем назад.

* Крок 3. Вешаем наш выраб на дрэва або балкон і насыпаем у яго корм.

Варыянт 2

Што трэба: цукерачная скрынка, скотч, нож або нажніцы, вяроўка.

* Крок 1. Купляем каробку шакаладных цукерак, з асалодай з'ядаем цукеркі.

* Крок 2. Робім дах. Праразаем бакавыя сценкі крышкі скрыні пасярэдзіне, згінаем яе пад прамым вуглом і заклейваем стыкі скотчам.

* Крок 3. Робім дно кармушкі. Прыкідваем, якога яно мае быць памеру, пазначаем і адразаем лішак. Месцы злучэнняў склейваем скотчам. Злучаем дах з дном і замацоўваем вяроўку.

Варыянт 3

Што трэба: пакет з-пад соку або малака, нож і нажніцы, аловак, вяроўка або дрот.

* Крок 1. Памыйце і прасушыце пакет. Заклейце верхнюю частку.

* Крок 2. Нажом выражце квадрацікі з абодвух бакоў пакета. У ніжняй частцы з дапамогаю нажніц зрабіце адтуліну (скразную), у атрыманую дзірку ўстаўце аловак – гэта будзе жардзіна, каб птушцы зручна было сядзець.

* Крок 3. Для таго, каб павесіць кармушку, у самым версе пакета прарабіце дзве дзіркі і працягніце ў іх дрот або вяровачку.

4 ПРЕДПОЛОЖЕНИЯ О ПРОИСХОЖДЕНИИ СЛОВА «ОК»

1. Самое распространённое предположение, что О.К. произошло от места рождения президента США Мартина Ван Бюрена — Kinderhook, штат Нью-Йорк. Ван Бюрен выбрал себе псевдоним Old Kinderhook, приведший к рекламному слогану «Old Kinderhook is O.K.» его кампании в 1840 году, распространяемому Демократической партией.

2. Второе предположение — выражение О.К. появилось для обозначения аббревиатуры выражения «oll korrect», которое появилось в качестве шутки (неправильное написание английского «all correct», что значит «всё правильно») в бостонской газете в 1839 году. Ещё одна подобная гипотеза состоит в том, что президент США Эндрю Джексон употреблял это выражение при принятии административных решений. Он писал «all correct» на немецкий манер «oll korrekt», или, сокращённо, «O.K.».

3. Существует версия о немецком происхождении. Корректоры, которым присылали статьи перед печатью в газетах, в случае отсутствия правок ставили на статье отметку «O.K.», «ohne Korrektur», то есть «без корректуры».

4. Французы полагают, что О.К. возникло во время войны, когда в ежедневном рапорте о потерях писали «0 killed» («ноль убитых»), что для краткости стали произносить «О К» («Оу Кей»). Это же выражение использовали английские лётчики, сообщавшие после боя командованию, что у них нет потерь.

МИНУТКА ЮМОРА

Есть ли разница между мужчиной и ребёнком? По мнению женщин, большой разницы нет, но ребёнка хотя бы можно оставить одного с няней.


А вы замечали, что гости, уходя, спрашивают: «Мы ничего не забыли?», а родственники: «Мы всё взяли?».

— Па-ап, как ты сдавал экзамены? Научи, а...
— Да вам, девушкам, вообще легко, приподняла юбочку, и всё!
— А если преподаватель женщина?
Отец, с минуту подумав:
— Дура! Я имел в виду: приподняла юбочку... достала шпаргалку.

ВИНИ ПУХ

в Армении - Ваник Пухоян
в Грузии - Винико Пухишвили
в Азербайджане- Винизаде Пухоглу
в Италии - Винсенте дель Пухини
в России - Винни Владимирович Пухин
в Китайе - Вин Ни Пух
в Испании - Дон Виннио Пухалес
в О.А.Э - ВИНИ Абдель бен Хамид аль-ПУХ





КЛІМАВІЦКАЯ ІНФА-ПАНАРАМА

Клімавіцкі грамадска-палітычны бюлетэнь
Адказны за выпуск: Аржанцаў Сяргей Юр'евіч
Адрас: Клімавічы, вул. Леніна, д. 27а, кв.15.
Надрукавана на ўласным абсталяванні. Наклад 299 асобнікаў
Распаўсюджваецца бясплатна